**У гонар** героя-выпускніка / падрыхт. Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. — 2022. — 19 лют. — С. 11.

## У ГОНАР ГЕРОЯ-ВЫПУСКНІКА

**Імя воіна-інтэрнацыяналіста Леаніда Мікалаевіча Бяліцкага прысвоена сярэдняй школе № 3 Віцебска.**

У мерапрыемстве прынялі ўдзел брат і пляменнік692 гераічнага лётчыка Анатоль і Дзмітрый Бяліцкія. Ганаровымі гасцямі ўстановы адукацыі ў знамянальны дзень яе гісторыі сталі таксама старшыні абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімір Бялевіч і абласной арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валяр'ян Мацкевіч, кіраўнікі структурных падраздзяленняў аблвыканкама, намеснік старшыні гарвыканкама Віктар Глушын, кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Юрый Панфілаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, ветэраны-інтэрнацыяналісты.

Да мемарыяльнай дошкі ў гонар выпускніка-афганца ўсклалі кветкі. З кранальнымі канцэртнымі нумарамі поруч з навучэнцамі выступілі салісты абласной філармоніі Надзея Драга і групы «103 рэгіён» гвардыі лейтэнант Аляксей Масальскі. Юныя экскурсаводы школы азнаёмілі з вынікамі пошукавай і даследчай дзейнасці, што каардынуе кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні Уладзімір Гагаеў. Моцнае ўражанне на ўсіх удзельнікаў урачыстасці зрабіла прысвечаная жыццю і подзвігу Леаніда Бяліцкага прэзентацыя, якую падрыхтавалі навучэнцы разам з педагогамі. Сярод паказаных у ёй фота-, аўдыя- і відэаматэрыялаў нямала ўнікальных знаходак, уключаючы ліст Леаніда Мікалаевіча з Афганістана да маці і ўспаміны яго таварыша па службе, запісаныя школьнікамі.



Падчас службы ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане лётчык першага класа Леанід Бяліцкі здзейсніў 1008 баявых вылетаў, у тым ліку на цяжкадаступныя высакагорныя пляцоўкі. Калі верталёт Леаніда Мікалаевіча ў ходзе высадкі паветранага дэсанта быў збіты, экіпаж накіраваў падаючую машыну на агнявы пункт маджахедаў. Мужнасць і гераізм Леаніда Бяліцкага адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Пасмяротна віцяблянін быў узнагароджаны ордэнам Леніна і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». Імя лётчыка носіць вуліца ў Віцебску, а мемарыяльная дошка на будынку роднай школы ўвекавечыла яго памяць у 2012 годзе. Як паведаміла дырэктар Ірына Ламаносава, з ініцыятывай прысваення школе імя славутага выпускніка напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і 33-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана ўстанова адукацыі выступіла сумесна з абласной і гарадской («Братэрства») арганізацыямі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Цяпер чатыры школы на Віцебшчыне носяць імя воіна-афганца. У планах калектыву сярэдняй школы № 3 – адкрыццё прысвечанага Леаніду Бяліцкаму музейнага пакоя.

Падрыхтавала **Таццяна Бондарава**